ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (1018) ● ЧАЦВЕР, 14 чэрвеня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

● ГОСЦІ БДУ ● СІЛЫ СПРАБУЮЦЬ АБІТУРЫЕНТЫ ● ТЭХНІЧНЫЯ СРОДКІ — НА СЛУЖБУ ВУЧОБЕ ● У ІНТЭРНАТАХ ● РАСКАЗВАЕ «ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ» ● ДАРОГІ КЛІЧУЦЬ ПРАКТЫКАНТАЎ.

## НАШЫ ГОСЦІ

З 7 па 10 чэрвеня гасцямі нашага універсітэта былі прадстаўнікі Ягелонскага універсітэта (ПНР). Дэлегацыя, у склад якой уваходзілі рэктар універсітэта, прафесар Мечыслаў Карась, сакратар партарганізацыі ... Паўліца, старшыня праф...за Сільвестр Вуйцік, дэкан матэматычнага, фізічнага і хімічнага аддзяленняў Анджэй Лясота, загадчык кафедры гіс...орыі Уладзіслаў Серчык, стар...чя маладзёжнай арганізацыі ...лчык, пазнаёмілася з на...а універсітэтам, наведала ...тарычны, філалагічны, хімічны, біялагічны, фізічны факультэты, бібліятэку БДУ, вылічальны цэнтр. Госці з асаблівым захапленнем знаёміліся з фізічным факультэтам, музеямі гістфака.

Польскія сябры пабывалі ў ...арускім тэатры імя Я. Купа..., на Кургане Славы, наведалі Хатынь, музеі Мінска і выказалі задавальненне ад знаёмства з беларускай сталіцай і яе гістарычнымі помнікамі.

У выніку візіту была выпрацавана і падпісана рабочая праграма супрацоўніцтва двух універсітэтаў на 1973—1975 гады. Яна прадугледжвае абмен вучонымі, прафесарска-выкладчыцкімі кадрамі, аспірантамі, стажорамі, студэнцкімі будаўнічымі атрадамі, маладзёжнымі дэлегацыямі. Выказана ўпэўненасць, што дружба двух універсітэтаў будзе мацнець з году ў год.

***

Цесныя сувязі існуюць паміж Беларускім і Сафійскім універсітэтамі. Стаў традыцыяй абмен дэлегацыямі, творчымі калектывамі. У панядзелак наш універсітэт гасцінна сустрэў балгарскіх гасцей—рэктара Сафійскага універсітэта акадэміка Хрыста Хрыстава і сакратара партыйнай арганізацыі Запрана Запранава. Госці знаёмяцца з факультэтамі універсітэта, сталіцай Беларусі.

Дэлегацыя будзе ў Мінску да 15 чэрвеня.

**Наш кар.**

## ТЭХНІЧНЫМ СРОДКАМ— ЗЯЛЁНУЮ ВУЛІЦУ

Павышэнне эфектыўнасці навучання ў вышэйшай школе павінна базіравацца на арганічным спалучэнні апраўдаўшых сябе традыцыйных метадаў з новымі, з шырокім выкарыстаннем тэхнічных сродкаў навучання (ТСН) пры аўтаматызацыі іх кіравання.

Тэхнічныя сродкі робяць больш эфектыўнай педагагічную працу выкладчыкаў, садзейнічаюць больш глыбокаму вывучэнню і засваенню складаных раздзелаў вучэбнага матэрыялу.

Укараненне тэхнічных сродкаў і праграміраванага навучання ва універсітэце здзяйсняецца ў адпаведнасці з распрацаваным рэктаратам перспектыўным планам на 1971—1975 гады. Планам прадугледжана шырокае ўкараненне ў навучальны працэс кантралюючых і навучаючых машын, безмашыннага праграміраванага навучання, вучэбнага кіно, радыё, тэлебачання, дыяпраекцыйных і магнітафонных установак, вылічальнай тэхнікі, комплекснае аснашчэнне паточных аўдыторый тэхнічнымі сродкамі з дыстанцыйным кіраваннем. Выкананне намечаных планам мерапрыемстваў знаходзіцца пад пастаянным кантролем рэктарата, парткома, вучэбнага аддзела.

Як здзяйсняюцца намечаныя мерапрыемствы, якія цяжкасці неабходна пераадолець, якія праблемы чакаюць рашэння ў бліжэйшы час і да канца пяцігодкі, каб тэхнічныя сродкі ў навучальным працэсе атрымалі зялёную вуліцу?

За апошнія два гады кафедрамі, факультэтамі набыта вялікая колькасць розных відаў ТСН: звыш 70 дыяпраектараў, больш 50 магнітафонаў, 27 кантралюючых і навучаючых машын КИСИ-5, чатыры вузкаплёначныя кінапраектары «Украіна 4м», два шырокаплёначныя кінапраектары, дзесяткі фота- і кінакамер.

На факультэце журналістыкі створана і з поспехам выкарыстоўваецца замкнутая тэлевізійная сістэма ПТУ-101, абсталявана студыя гуказапісу, уведзена ў эксплуатацыю ўнутрыуніверсітэцкая радыётрансляцыйная сетка, распачата падрыхтоўка да ўкаранення з новага года бачнамагнітнага запісу.

Кафедрай гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў набыты кінафрагменты па вялікаму раздзелу гісторыі КПСС, паточная аўдыторыя абсталявана шырокаплёначнай кінаўстаноўкай; на лекцыях і семінарскіх занятках шырока выкарыстоўваюцца кінафільмы і кінафрагменты, дыяпазітывы, магнітафонныя запісы прамоў У. І. Леніна.

Інтэнсіўна выкарыстоўваюцца ў час вучэбных заняткаў дыяпазітывы, дыяфільмы кафедрамі агульнай, ядзернай фізікі, гісторыі БССР і некаторымі кафедрамі біялагічнага факультэта. На філалагічным факультэце створан і ўжо два гады паспяхова дзейнічае гукатэхнічны кабінет, у гэтым годзе абсталяван лінгафонны кабінет, дзе адначасова могуць займацца 24 чалавекі. На падрыхтоўчым факультэце пачаўся мантаж лінгафоннага кабінета з паўкабінамі на 16 навучэнцаў. Кожнае рабочае месца абсталявана магнітафонам і мікрафонна-тэлефонным прыстасаваннем. Усяго да пачатку новага навучальнага года універсітэт будзе мець два гукатэхнічныя і тры магнітафонныя кабінеты на 100 чалавек. У 1974 годзе запланавана стварыць яшчэ шэсць лінгафонных кабінетаў на 128 навучэнцаў, г. зн. к канцу пяцігодкі універсітэт будзе мець не менш 10 лінгафонных кабінетаў.

На працягу 1972—1973 навучальнага года радыёфікавана з дапамогай радыёмікрафонаў РМ-7 дзве аўдыторыі на фізічным факультэце, па адной — на геаграфічным, юрыдычным, філалагіч-

(Працяг на 2-й стар.)







## У АБ'ЕКТЫВЕ—БІЯФАК

**На здымках зверху ўніз:**

*Лабараторныя заняткі па заалогіі беспазваночных са студэнтамі I курса праводзіць дацэнт М. М. Драко.*

*Студэнты IV курса З. Ляшчынская, Н. Башаркевіч і В. Царук праводзяць доследы ў навуковым гуртку пры кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл.*

*Студэнты-пяцікурснікі В. Грушнік, О. Бялецкая і аспірант М. Шолух вядуць біяхімічны эксперымент.*

*Старшыя лабаранты кафедры беспазваночных С. А. Байкова і Л. Р. Дубкова заняты падрыхтоўкай наглядных вучэбных дапаможнікаў.*

*Прафесар Ю. К. Фамічоў і асістэнт кафедры мікрабіялогіі А. М. Сельскоў абмяркоўваюць вынікі доследаў па вывучэнню фагаў малочнакіслых бактэрый.*

*Фота Д. ПРЭСА.*





## ТРЫМАЮЦЬ ЭКЗАМЕН АБІТУРЫЕНТЫ...

Яшчэ ў разгары сесія ў студэнтаў стацыянара, а ў экзаменацыйныя выпрабаванні ўступіў новы атрад — 1594 абітурыенты завочнага факультэта.

— І хоць былі свае цяжкасці, — расказвае намеснік сакратара прыёмнай камісіі дацэнт Генадзь Аляксеевіч Браніцкі, — мы змаглі арганізаваць кансультацыі, правялі агульны сход з усімі абітурыентамі, на якім выступілі прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню У. Р. Івашын, адказны сакратар і яго намеснікі. Расказалі аб парадку правядзення экзаменаў, аб правілах, якіх трэба прытрымлівацца, падбадзёрылі, пажадалі поспехаў.

У сёлетніх абітурыентаў вялікай папулярнасцю карыстаецца аддзяленне правазнаўства. Сюды пададзена 535 заяў на 150 планавых месц. Усе паступаючыя маюць вытворчы стаж, 57 чалавек — з сельскай мясцовасці, астатнія — з розных гарадоў Беларусі.

Права вучыцца на аддзяленні гісторыі адстойваюць 269 чалавек. Амаль тры чалавекі на месца прэтэндуюць на аддзяленні біялогіі.

Цікава, што сярод 145 абітурыентаў гэтага аддзялення толькі 15 мужчын.

Цяпер, калі адбылося ўжо шмат экзаменаў, можна сказаць, што ўсё ідзе нармальна. Парадавалі першымі поспехамі паступаючыя на аддзяленне журналістыкі. З трох груп толькі двое атрымалі нездавальняючыя адзнакі на вусным экзамене па рускай мове і літаратуры.

А сёння вы можаце самі пабываць на экзамене, пазнаёміцца з абітурыентамі...

Галоўны універсітэцкі корпус. Пазнаць аўдыторыю, дзе праходзіць экзамен, не цяжка. Каля яе асаблівы настрой хвалявання і зацікаўленасці. Зойдзем у 601-ю. Тут экзаменуюцца па гісторыі СССР абітурыенты-правазнаўцы. Экзаменатары — М. А. Гарбар і В. А. Шалкапляс, прысутнічае старшыня прадметнай камісіі Я. А. Васілеўская. Перш чым слухаць адказы, аглядаем аўдыторыю і зазначаем, што групе № 33, якая здае тут экзамен, не пашанцавала. У беспарадку стаяць груваcткія крэслы, нязручна і экзаменатарам і абітурыентам. Што ж, гэта, можа, і дробязь, але лепш, каб дробязі садзейнічалі добраму настрою...

Заканчвае адказ і, атрымаўшы «добра», ліха паварочваецца на абцасах абітурыент у міліцэйскай форме. Яго месца займае наступны. Не будзем засмучаць яго яшчэ больш, назваўшы прозвішча, але адказ большай, чым «нездавальняюча», адзнакай ацаніць было немагчыма. Нават на пытанне аб утварэнні СССР, рэспубліках, якія першапачаткова ўвайшлі ў яго састаў, ён не змог адказаць правільна. Хлопец у мінулым годзе скончыў тэхнікум і, трэба думаць, рыхтаваўся да экзаменаў. Дзіўна, што не адбілася на ведах гэтага юнака шырокае святкаванне 50-годдзя СССР.

(Працяг на 2-й стар.)

# ТРЫМАЮЦЬ ЭКЗАМЕН АБІТУРЫЕНТЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Слесар механа-зборачных работ Т. Я. Шаройка даўно марыць стаць юрыстам. Мяркуючы па яе адказу, дзяўчына прыклала нямала намаганняў, каб добра засвоіць праграмны матэрыял. З задавальненнем слухалі экзаменатары і В. В. Анціпенку.

— Вельмі талковы адказ, — быў аднадушны вывад.

На гэтым жа паверсе, у аўдыторыі № 604, экзаменуюцца абітурыенты групы № 1 аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры. Тут абставіны зусім іншыя: светла, утульна, добрая мэбля. А веды — горшыя, чым у папярэдняй групы. У ведамасці многа пасрэдных і нездавальняючых адзнак.

— Адказваюць вельмі слаба. І гэта традыцыйна ў групах беларускага аддзялення, — падкрэсліваюць і В. Н. Рабцэвіч, і У. Н. Сідарцоў.

Каб атрымаць больш аб'ектыўнае ўражанне, мы з Яўгеніяй Арцёмаўнай Васілеўскай выраšаем зайсці яшчэ ў адну групу правазнаўцаў. Тут экзамен падыходзіць к канцу. І таму Міхаіл Рыгоравіч Петачэнка з поўнай падставай характарызуе групу ў цэлым як даволі моцную, адзначае ўменне абітурыентаў аналізаваць матэрыял, рабіць правільныя вывады, прымяняць ленінскія ацэнкі вузлавых момантаў айчыннай гісторыі. Ён называе тых, хто выдатна вытрымаў экзамен: гэта супрацоўніца брэсцкага ЗАГСа Т. Н. В'юн, рабочыя В. У. Хаценаў з Барысава, мінчанін Г. П. Ліпскі і многія іншыя.

Экзамены працягваюцца, і поспех спадарожнічае тым, хто больш настойліва імкнуўся да мэты, накапіўшы неабходны запас ведаў.

А. АЛЕНІЧ.



Сачыненне па літаратуры пішуць абітурыенты юрыдычнага аддзялення.
Фота Д. Чаховіча.



# ТЭХНІЧНЫМ СРОДКАМ—ЗЯЛЁНУЮ ВУЛІЦУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ным, на ваеннай кафедры адна аўдыторыя на 100 месц абсталявана комплексам тэхнічных сродкаў з дыстанцыйным кіраваннем з пульта выкладчыка. Да пачатку новага навучальнага года плануецца абсталяваць комплексам тэхнічных сродкаў дзве аўдыторыі на фізічным факультэце і па адной на матэматычным і гістарычным, стварыць лабараторыю кантралюючых машын і тэхнічных сродкаў навучання. Кафедра ЭММ фізічнага факультэта распрацоўвае шматпультавую навучаючую сістэму на базе ЭВМ з разлікам стварыць адзін клас к канцу 1975 года.

Рэктаратам прымаюцца меры да таго, каб у 1973 годзе абсталяваць усе аўдыторыі шклянымі мелавымі дошкамі, а ў 1974 годзе—лабараторыі і кабінеты. У сувязі з гэтым трэба сказаць, што гаспадарчая частка і вучэбна - вытворчыя майстэрні пакуль не змаглі забяспечыць высокіх тэмпаў работ па прыгатаванню шкляных дошак. За пяць месяцаў бягучага года зроблена каля 30 дошак, што складе прыкладна 10—15 працэнтаў ад плана на год. Пры такіх тэмпах рашэнне рэктарата аб абсталяванні ў 1973 годзе шклянымі дошкамі ўсіх аўдыторый не будзе выканана.

Як ужо гаварылася, у цэлым універсітэт мае дастатковую колькасць дыяпраекцыйных сродкаў, але, на жаль, каэфіцыент выкарыстання іх невялікі. Адна з прычын гэтага—адсутнасць дыяпазітываў і дыяфільмаў, паколькі цэнтралізавана выпрацоўваецца іх вельмі мала, а стварэнне іх ва універсітэце не арганізавана. Для інтэнсіўнага ўкаранення ў навучальны працэс кіно і дыядапаможнікаў наспела настойлівая неабходнасць стварэння агульнауніверсітэцкай кінафоталабараторыі. У структуры кінафоталабараторыі павінны быць прадугледжаны фільматэка, фататэка, вучэбны, вытворчы і метадычны сектары. У перспектыве пара вырашаць пытанне аб стварэнні кафедры тэхнічных сродкаў навучання і ўвядзенні ў вучэбныя планы для педагагічных патокаў дысцыпліны «ТСН і методыка іх выкарыстання ў школе». Цяпер гэтыя пытанні вывучаюцца рэктаратам.

Вялікія задачы савет універсітэта паставіў перад прафесарска-выкладчыцкім саставам па распрацоўцы метадычных і псіхолага - педагагічных пытанняў выкарыстання тэхнічных сродкаў у навучальным працэсе, па прыцягненню студэнтаў і супрацоўнікаў да распрацоўкі і ўдасканалення ТСН, комплекснага аснашчэння аўдыторый тэхнічнымі сродкамі. Уяўляецца мэтазгодным расшырыць тэматыку курсавых і дыпломных работ па праблеме выкарыстання ТСН.

Толькі агульнымі намаганнямі рэктарата, дэканатаў, кафедр, партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый мы зможам дабіцца таго, каб наш універсітэт стаў вядучым у рэспубліцы па ўкараненню праграміраванага навучання і тэхнічных сродкаў.

М. НІКІЦЕНКА,
інжынер вучэбнага аддзела.

## ЭКЗАМЕНУЕ СЕСІЯ



У ІНТЭРНАТАХ

# СПРАВЫ ДАМАШНІЯ

У гэтыя гарачыя дні сесіі наш карэспандэнт наведаў два студэнцкія інтэрнаты.

**Інтэрнат № 7, вуліца Кастрычніцкая.**

Заходзіць сонца. Залатым агнём гараць вокны аднаго з самых высокіх будынкаў вуліцы. На спартыўных пляцоўках ля інтэрнатаў, як заўсёды, мнагалюдна. З адкрытага акна сёмага паверха нехта пускае вялікім люстэркам сонечныя зайчыкі. Знешне нішто не гаворыць аб сесіі. І толькі запоўненыя чытальныя залы, разгорнутыя падручнікі на сталах напамінаюць аб ёй.

Звяртаемся да дзяўчат, якія аб нечым ажыўлена гутараць у калідоры пятага паверха. Яны — студэнткі матэматычнага факультэта.

— Як вы лічыце, у вашым інтэрнаце ёсць умовы для добрай падрыхтоўкі да экзаменаў?

— Зразумела. На кожным паверсе, пачынаючы з трэцяга, ёсць «чыталкі». Там амаль заўсёды можна знайсці свабоднае месца. Абедаем мы ў буфеце, куды кожны дзень прывозяць гарачую страву. Ці бывае шумна? Як калі. А наогул, нішто не перашкаджае. Да таго ж, на ўсіх паверхах ёсць дзяжурныя.

Заглядваем у «чыталкі». У некаторых 20 сталоў, у іншых жа крыху больш дзесяці, таму амаль палова пакоя пустуе. Міжволі хочацца запытаць: чаму не паставіць сюды яшчэ некалькі сталоў?

Сталовая інтэрната разлічана на 50 чалавек. Гэта нямнога, але калі ўлічыць, што ёсць добрая сталовая насупраць, праз вуліцу, і ў інтэрнаце № 5, можна зрабіць вывад, што асаблівай праблемы з абедамі не існуе.

Нягледзячы на сесію, працягвае работу гурток бальнага танца. Два разы ў тыдзень наведваюць яго каля 50 чалавек — жыхароў інтэрната № 7.

**Інтэрнат № 4, Паркавая магістраль.** У апошні тыдзень трапіць сюды даволі цяжка. Падыходзім да дзвярэй і чытаем: «Уваход побач». Цягнем за другія дзверы — ніякага выніку. Аказваецца, уваход праз дзверы на процілеглым баку. Не ўгледзеўшы своечасова стрэлку-указальнік, не трапіш адразу і на другі паверх. Што гэта? Можа, жыхары інтэрната гуляюць у «вясёлы лабірынт»? Не. Проста ў інтэрнаце № 4 рамонт. Пачалі яго яшчэ ў красавіку. Усё перацярпелі жыхары гэтага дома: і грукат, і пах фарбы, ад якога днём і ноччу балела галава, а зараз вось прывучаюць хадзіць па «спіралі». Некаторыя нервуюцца і злуюць. Дзе ж ім уцяміць, бедным, што гэта навуковая арганізацыя рамонтных работ: усе аперацыі робяцца па чарзе, паволі распаўсюджваючыся ў прасторы і часе.

Ну, а як з адзіным чытальным пакоем? Ён, як заўсёды, перапоўнен. А ленінскі пакой адкрываецца праз дзень. Таму прагнучым ведаў даводзіцца сядзець на падаконніках у калідорах і на лесвічных пляцоўках.

У колькі гадзін вы абедаеце? У дзве, тры?.. А вось жыхары інтэрната № 4 недзе а пятай гадзіне вечара. Буфет жа адкрываецца ў 16.00. Ды і бывае там часам толькі напітак, кіслая смятана ды булачкі. І ідуць студэнты ў бліжэйшыя кафэ і сталовыя.

Л. ГРЫГОР'ЕВА.





● Экзамен па лінейнай алгебры ў студэнтаў I курса матэматычнага факультэта прымае дацэнт кафедры алгебры М. С. ГАРАШЧУК.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

● Выдатна адказвае на пытанні экзаменатара А. А. Шынгеля студэнтка V курса юрыдычнага аддзялення завочнага факультэта Таццяна Ардашнікава на экзамене па грамадзянскаму працэсу.



ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

СЁННЯ Ў НАС У ГАСЦЯХ ГАЗЕТА

ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА

УНІВЕРСІТЭТА



*Так будзе выглядаць Гомельскі дзяржаўны універсітэт, будаўніцтва якога пачнецца ў гэтай пяцігодцы ў раёне вёскі Волатава.*

*Універсітэцкі гарадок разлічан на 14 тысяч студэнтаў. Тут будуць створаны ўсе ўмовы для плённай вучобы, навукова-даследчай работы, адпачынку.*

# У САДРУЖНАСЦІ З НАВУКАЙ

Навуковай работай ва універсітэце займаецца 1580 чалавек, або 44 працэнты студэнтаў. Асноўнай формай гэтай дзейнасці з'яўляюцца навуковыя гурткі пры кафедрах і непасрэдны ўдзел студэнтаў у выкананні дзяржбюджэтных і гаспадарча-дагаворных тэм. Усяго пры кафедрах сямі факультэтаў працуе 36 студэнцкіх навуковых гурткоў.

НДРС праводзіцца пад кіраўніцтвам 163 навукова-педагагічных супрацоўнікаў, з якіх 102 з'яўляюцца кандыдатамі і дактарамі навук.

Для выканання навуковай работы студэнтам прадастаўляюцца лабараторыі кафедр, аснашчаныя навейшым абсталяваннем, што дазваляе асвойваць сучасныя метады даследаванняў. Лепшыя студэнцкія работы прадстаўляюцца на універсітэцкія, рэспубліканскія і ўсесаюзныя конкурсы. Так, у мінулым годзе на рэспубліканскі агляд-конкурс было вылучана 158 навуковых студэнцкіх работ па прыродазнаўчых, тэхнічных і грамадскіх навуках. Аўтары лепшых студэнцкіх работ узнагароджаны дыпломамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, а таксама грашовымі прэміямі.

Акрамя таго, студэнты выступалі на навуковых студэнцкіх канферэнцыях, якія праводзяцца як ва універсітэце, так і ў вну Мінска, Магілёва, Мазыра, Гродна, Адэсы, Каўнаса, Кіева і іншых, а таксама на III і IV канферэнцыях лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу навуковых студэнцкіх работ па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках, якія праводзіліся ў Гомелі ва універсітэце і Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту.

Лепшыя навуковыя студэнцкія работы публікуюцца. Ужо ў бягучым годзе апублікавана 12 студэнцкіх работ. Студэнтамі зроблена звыш 30 розных лабараторных установак, макетаў і прыбораў, якія выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе.

Два студэнты фізічнага факультэта — А. І. Падалаў і А. Л. Жарын — сааўтары заяўкі, пададзенай у Камітэт па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў пры Савеце Міністраў СССР на прадмет вынаходніцтва.

**А. КІЕНЯ,**
**старшыня савета СНТ універсітэта, дацэнт.**

# ЭЛЕКТРОННЫЯ ПАМОЧНІКІ

У нашым універсітэце праграміраванне і метады машыннага рашэння задач вывучаюць матэматыкі, фізікі і эканамісты. Да іх паслуг ЭВМ «Мінск-22», «Мір-1», «Промінь-М», настольныя клавішныя ЭВМ і лічыльна-перфарацыйныя машыны. Да верасня 1973 года ў эксплуатацыю будзе ўведзена ЭВМ «Мінск-32» — адна з лепшых айчынных сучасных ЭВМ. У перспектыве—ЭВМ серыі ЕС-ЭВМ трэцяга пакалення.

На базе існуючага парка ЭВМ ва універсітэце праводзяцца шэраг цікавых даследаванняў, а таксама работы па ўкараненню АСК вышэйшай школы. Магчымасці выканання вучэбных, навукова-даследчых і кіруючых работ ва універсітэце значна ўзрастуць з запускам ЭВМ «Мінск-32».

**В. БЫХАЎЦАЎ,**
**загадчык кафедры ВМ і праграміравання, кандыдат тэхнічных навук.**



# НА АГЛЯДЗЕ— АГІТБРЫГАДЫ СБА

Больш як 650 студэнтаў універсітэта прымуць сёлета ўдзел у трэцім працоўным семестры. Яны будуць працаваць на меліярацыйных трасах, на новабудоўлях калгасаў, саўгасаў, на важнейшых камсамольскіх аб'ектах, на уборцы вінаграду і гародніны ў сонечнай Малдавіі.

На ўсіх факультэтах вядзецца дзейная падрыхтоўка да адказнай пары ў студэнцкім жыцці. Створаны 22 будаўнічыя атрады, зацверджаны іх камандзіры і камісары. Байцы прайшлі неабходную падрыхтоўку па тэхніцы бяспекі. Поўным ходам вядзецца здача нарматываў новага комплексу ГПА. Дэвіз СБА: «Кожны баец будаўнічага атрада — значкіст ГПА!»

Задача маладых будаўнікоў не толькі плённа папрацаваць на розных аб'ектах, але і пакінуць добры след на культурным фронце. Таму цяпер шмат клопатаў і ў членаў агітбрыгад. Рыхтуюцца канцэртныя праграмы, распрацоўваюцца лекцыі і даклады.

Гэтымі днямі ў актавай зале адбыўся агляд агітбрыгад і насценнага друку СБА. Са сцэны гучалі песні, аматары мастацкай самадзейнасці дэманстравалі сваё майстэрства ў танцах, пастаноўцы мініяцюр, у чытанні твораў беларускіх, украінскіх і іншых аўтараў.

Вялікую цікавасць выклікалі прыгожа афармленыя насценгазеты, фотагазеты, «баявыя лісткі», «маланкі».

Пераможцам агляду-конкурсу падрыхтоўчага перыяду прызнана агітбрыгада «Дэймас». Другое месца прысуджана атраду «Альба-73», трэцяе падзялілі агітбрыгады «Брыганціна» і «Беларусь». Усе гэтыя агітбрыгады ўзнагароджаны памятнымі падарункамі.

Журы адзначыла таксама добрую канцэртную праграму і выканаўчае майстэрства агітбрыгад «Атланты-73», «Нукліус», «Альтаір», якія прадстаўлены да ўзнагароджання граматамі абкома ЛКСМБ.

Як лепшая спецыяльным прызам адзначана насценгазета «Гамяльчанка». Дарэчы, яе выпускаюць дзяўчаты эканамічнага факультэта, якія сёлетнім летам будуць працаваць на вінаградных плантацыях Малдавіі.

*НА ЗДЫМКУ: выступаюць студэнты эканамічнага факультэта.*

# ДРУГІ Ў БЕЛАРУСІ

У 1949 годзе быў арганізаван факультэт фізічнага выхавання на базе Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Яго адкрыццё з'явілася вялікай падзеяй у спартыўным жыцці не толькі ў вобласці, але і Беларусі.

Сёлета мы адзначаем 20-годдзе першага выпуску факультэта фізічнага выхавання. У 1953 годзе ён даў пуцёўку ў жыццё сваім 13 першым выхаванцам.

За прайшоўшы час факультэт стаў другім цэнтрам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў у нашай рэспубліцы. За 20 год з яго сцен выйшла 2500 спецыялістаў фізічнага выхавання. У цяперашні час на факультэце існуюць кафедры: спартыўных гульняў і гімнастыкі, лёгкай атлетыкі, тэарэтычных асноў фізічнага выхавання і плавання, фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны. Большасць супрацоўнікаў кафедр з'яўляюцца выпускнікамі нашага універсітэта.

З 83 выкладчыкаў факультэта — адзін доктар навук, прафесар, 6 кандыдатаў навук, адзін чэмпіён Алімпійскіх гульняў, заслужаны майстар спорту, 15 майстроў спорту, 4 заслужаныя трэнеры БССР, 4 выдатнікі фізічнай культуры, 3 суддзі ўсесаюзнай катэгорыі, 10 суддзяў рэспубліканскай катэгорыі.

Для правядзення навукова-трэніровачнага працэсу ва універсітэце ёсць стацыянарная лыжная станцыя, зала цяжкай атлетыкі, выдатная зала і спартыўнае ядро з бегавой гумабітумнай дарожкай.

**А. СЯМІКОП,**
**дэкан факультэта, дацэнт.**



*НА ЗДЫМКУ: кандыдат у майстры спорту студэнт III курса Мікалай Бухараў у лабараторыі фізіялогіі спорту. Навукова-даследчая работа дапамагае яму дабівацца выдатных поспехаў у вучобе.*

# ПАКАЗВАЕ ТЭАТР МІНІЯЦЮР

Другі год у нашым універсітэце плённа працуе студэнцкі тэатр мініяцюр. Кіруе ім артыстка Гомельскага абласнога драматычнага тэатра А. М. Аляксандрава.

У сезоне гэтага года тэатр мініяцюр атрымаў папаўненне, у асноўным з ліку першакурснікаў гісторыка-філалагічнага факультэта. Усё гэта крыху ўскладніла працу тэатра: большасць навічкоў прыйшла на сцэну ўпершыню. Але кіраўнік тэатра разам са старэйшымі ўдзельнікамі смела ўзяліся за пастаноўку новай праграмы.

І вось першае выступленне на універсітэцкай сцэне, першыя заслужаныя апладысменты. Гледачы добра памятаюць мініяцюру «Звер» у выкананні студэнта І курса гісторыка-філалагічнага факультэта Уладзіміра Лапіцкага, «У пакоі крывых люстраў» у выкананні Галіны Ерафеенкі, Веры Віннікавай, Пятра Далганава і іншых.

Студэнцкі тэатр ужо не навічок на сцэне нашага універсітэта.

— Мы прыходзім на рэпетыцыі не для таго, каб у хуткім часе са сцэны весяліць гледачоў. Наш тэатр — гэта кафедра, з якой можна сказаць шмат добрых і шчырых слоў,— гаворыць Пётр Далганаў, — і ў гэтым яго прызванне.

Што робяць удзельнікі тэатра, каб павысіць сваё майстэрства?

— Сапраўды, мы не навічкі на сцэне, — расказвае Галіна Філіпава. — Вялікую дапамогу нам аказвае А. М. Аляксандрава. Для яе тэатр — гэта жыццё, прызванне. Любоў да мастацтва яна перадае і нам.

Часцей за ўсё героі, якіх мы паказваем на сцэне, простыя людзі. Але за гэтай прастатой трэба адкрыць гледачу духоўны свет героя з яго непаўторнай прыгажосцю. Гэтаму і шмат іншаму мы вучымся ў артыстаў нашага аблдрамтэатра, дзе мы вельмі частыя госці.

Ёсць у нашых рабят мара — паставіць на сваёй сцэне вялікі спектакль. Ужо нават знойдзена п'еса. Але гэта мара—і маленькая тайна нашага студэнцкага тэатра мініяцюр.

**В. НАВІЧЭНКА.**

# У ВОЛЬНЫ ЧАС

**У нашым універсітэце выдатная актавая зала. На яе сцэне амаль кожны тыдзень наладжваюцца канцэрты. Перад студэнтамі часта выступаюць папулярныя артысты з розных гарадоў краіны. Нашымі гасцямі былі такія вядомыя артысты, як Тамара Міянсарава, Мая Крысталінская, Барыс Штокалаў, Віктар Вуячыч, кампазітар Марк Фрадкін з групай выканаўцаў яго песень, беларускі народны хор, ленінградскі цырк і многія іншыя вядучыя майстры савецкага мастацтва.**

**Для студэнтаў універсітэта чытаюцца лекцыі аб выяўленчым мастацтве, арганізуюцца іншыя захапляючыя мерапрыемствы. Асабліва мнагалюдна бывае на вечарах, калі праводзяцца сустрэчы каманд факультэтаў у клубе вясёлых і знаходлівых.**

**Кожны год каля 500 студэнтаў адпачываюць у спартыўна - аздараўленчым лагеры, больш 200— у дамах адпачынку, санаторыях, на турбазах. Амаль кожны другі студэнт удзельнічае ў экскурсіях па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Вялікую цікавасць выклікаюць паездкі ў Брэст, Кіеў, Мінск, Маскву, Ленінград, Хатынь, да Кургана Славы, на Далёкі Усход, у Сярэднюю Азію і іншыя мясціны.**

**Традыцыйныя сустрэчы за «круглым сталом» у інтэрнатах, культпаходы ў кіно, калектыўныя прагулкі на цеплаходзе па Сожу, выезды на ўлонне прыроды згуртоўваюць выхаванцаў універсітэта, робяць іх жыццё вясёлым і змястоўным.**

**М. БАЙДА,**
**старшыня прафкома.**

# ЛЕТА—ПАРА ПРАКТЫКІ

—Сёлета на прадпрыемствах і ў навукова-даследчых установах да практыкі прыступяць 160 пяцікурснікаў, — расказвае дэкан хімічнага факультэта Фёдар Мікалаевіч Капуцкі. — па Салігорскім каліійным камбінаце, Гомельскім шклозаводзе, мінскіх заводах медыцынскіх і эндакрынных прэпаратаў. Магілёўскім заводзе штучнага валакна і на іншых прадпрыемствах яны будуць вывучаць тэхналогію вытворчасці, эканоміку, весці грамадска-палітычную работу. Якраз сёння мы абмеркавалі праграму грамадска - палітычнай практыкі з загадчыкамі кафедр і адказнымі за яе правядзенне, дамовіліся аб кантактах з кафедрай гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў па пытаннях планавання гэтай практыкі.

Пры размеркаванні студэнтаў па месцах практыкі на факультэце

## ЧАС УЗМУЖНЕННЯ

ўлічваюць магчымасці для выканання дыпломнай работы, уладкавання з жыллём. Перавага аддаецца тым прадпрыемствам, дзе студэнты змогуць працаваць на рабочых месцах. Гэта робіць практыку больш эфектыўнай, дазваляе лепш і хутчэй асвоіць вытворчыя працэсы.

На кожнай кафедры вылучаны адказныя, якія кантралююць ход студэнцкай работы ў гэты перыяд і дапамагаюць вырашаць усе пытанні. Тут жа распрацоўваюцца індывідуальныя заданні для кожнага практыканта.

Частка пяцікурснікаў накіравана ў розныя інстытуты Акадэміі навук БССР, некаторыя застаюцца на кафедрах, прымуць удзел у гаспадарчадагаворных работах.

Пара практыкі—пара узмужнення выпускніка, проба яго самастойнасці. І таму ў гэты час так многа ўвагі аддаецца пытанням практыкі і ў дэканаце. і на кафедрах.

**У. СІЛІЧ.**



*На камбінаванай здымцы па тапаграфіі студэнты-завочнікі II курса. Кіруе заняткамі дацэнт кафедры геадэзіі і картаграфіі Р. А. Жмойдзяк.*



*У гэтых палатках жывуць студэнты геафака.*

## ПАЧЫНАЮЦЦА ПАДАРОЖЖЫ

У працэсе падрыхтоўкі географаў практыцы адводзіцца асаблівае месца. Яна прадстаўлена дзесяццю відамі і займае пятую частку вучэбнага часу.

Вучэбная практыка першых курсаў стацыянара і вячэрняга аддзялення і II курса завочнага факультэта праводзіцца на геабазе «Заходняя Беразіна». З гэтага года тут жа арганізуецца правядзенне гідрагеалагічнай, геамарфалагічнай і батанічнай практык, астатніх — у ваколіцах Мінска — Зялёным, Ждановічах, Вязынцы, Радашковічах і інш.

У апошнія два гады абноўлены праграмы вучэбнай практыкі па геадэзіі, глебазнаўству, геалогіі, метэаралогіі дастасоўна да ўмоў геабазы. Азнаямленчая практыка-экскурсія, якая праводзілася раней на III курсе ў канікулярны час, перанесена на II і праводзіцца як комплексная геаграфічная. На працягу першых дзесяці дзён студэнты на геабазе адпрацоўваюць метады палявых даследаванняў, вывучаюць асаблівасці прыродных комплексаў і адначасова выконваюць праграму эканоміка-геаграфічнай практыкі. Другі этап працягваецца 21 дзень. Студэнты вывучаюць асаблівасці прыродных умоў і эканомікі розных прыродных зон краіны па чатырох маршрутах — Паўночнаму, Закарпацкаму, Дняпроўска-Крымскаму, Каўказскаму. У якасці апорных пунктаў у час далёкіх практык будуць выкарыстаны вучэбныя геабазы Крымскага, Тбіліскага і Чарнавіцкага універсітэтаў. У далейшым прадугледжваецца з гэтай мэтай выкарыстаць базы Петразаводскага, Растоўскага, Львоўскага і Кіеўскага універсітэтаў.

Яшчэ ў снежні складзен графік правядзення практык. Распрацаваны палажэнні, правілы ўнутранага распарадку на геабазе, абавязкі кухоннага нараду і дзяжурнага па лагеру.

У сёлетнім навучальным годзе вялікая ўвага ўдзяляецца грамадска-палітычнай практыцы. Стала традыцыяй выступленне студэнтаў з дакладамі і канцэртамі мастацкай самадзейнасці перад насельніцтвам Валожынскага раёна. Цяпер кафедрамі прапанавана 50 тэм дакладаў для выступлення студэнтаў перад насельніцтвам. На факультэце складзен спецыяльны план грамадска-палітычнай практыкі.

З 1 чэрвеня ўжо знаходзіцца на вытворчай практыцы група студэнтаў IV курса, 15—16 чэрвеня ад'язджаюць студэнты III курса, 22-га — усе студэнты IV курса. Група трэцякурснікаў на чале з дацэнтам Ф. С. Фешчанкам накіроўваецца на вытворчую практыку ў Балгарыю.

**В. АНОШКА,**
**ст. выкладчык.**

## У РОЛІ АРХЕОЛАГАЎ

Каля 150 студэнтаў гістарычнага факультэта 3 ліпеня выедуць на археалагічную практыку ў г. Рагачоў Гомельскай вобласці. Яны прымуць удзел у раскопках аднаго з невялікіх гарадкоў Старажытнай Русі, упамянутага ў летапісе пад 1142 г. Недалёка ад месца ўпадзення Друці ў Днепр на высокім беразе захаваліся рэшткі гарадзішча, акружанага штучным рвом. Студэнтам прадстаіць пазнаёміцца з прыёмамі раскопак старажытных пасяленняў, вывучыць культурныя слаі гарадзішча, якія змогуць расказаць аб пачатковай гісторыі горада, аб часе яго ўзнікнення, аб асноўных рысах матэрыяльнай культуры. У раёне горада раней былі зарэгістраваны таксама курганы. Магчыма, што студэнты правядуць археалагічнае абследаванне прылягаючых да горада раёнаў і пазнаёмяцца з методыкай раскопак курганаў.

Варта адзначыць, што археалагічнае вывучэнне Рагачова з'яўляецца працягам шматгадовых даследаванняў археалагічных помнікаў эпохі Старажытнай Русі ў Падняпроўі, якія праводзіць экспедыцыя універсітэта. Раней раскопкі вяліся ў Стрэшыне, Копысі і Свіслачы. Увесь атрыманы матэрыял будзе перададзен у гістарычны музей БДУ.

**Э. ЗАГАРУЛЬСКІ,**
**кіраўнік археалагічнай экспедыцыі, дацэнт.**

**У БІБЛІЯТЭЦЫ БДУ**

### НОВЫЯ КНІГІ ПА ХІМІІ

1. Батлер, Джеймс Н. Ионные равновесия. (Мат. описания). Пер. с англ. Под ред. канд. хим. наук А. А. Пендина. Л., «Химия», 1973.
2. Зонтаг, Г. и Штренге, К. Коагуляция и устойчивость дисперсных систем. Пер. с нем. и ред. О. Г. Усьярова. Л., «Химия», 1973.
3. Мелешина, А. М. Введение в теорию электронных оболочек молекул. Часть I. Воронеж, Изд-во Воронеж. ун-та, 1973.
4. Петренко, Д. С. Пиридиновые и хинолиновые основания. Изд. 2-е, доп. и пер. М., «Металлургия», 1973.
5. Полимеризация виниловых мономеров. Под ред. Д. Хэма. Пер. с англ. М., «Химия», 1973.
6. Работы по электрохимии, органической химии, радиохимии. (Сборник статей.) Пермь, 1972.
7. Химия и методы исследования органических соединений. Кн. 23. М., «Химия», 1973.
8. Тарасевич, Н. И. и др. Методы спектрального и химико-спектрального анализа. Под ред. акад. И. П. Алимарина. М., Изд-во Моск. ун-та, 1973.

**ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ**

## «НАС ЧАКАЮЦЬ»

На пасяджэнні культмасавага сектара камітэта камсамола было разгледжана пісьмо А. Новікава «Нас чакаюць» аб рэйдах агітбрыгады ФПМ. Вялікая работа, праведзеная агітбрыгадай факультэта, заслугоўвае ўвагі.

Правядзенне такіх рэйдаў з'яўляецца адной з форм работы культмасавых сектараў факультэтаў. Да гэтага часу на факультэтах практыкаваліся аднадзённыя выезды агітбрыгад у саўгасы, воінскія часці, на прадпрыемствы. Вядома, здзяйсненне шматдзённых выездаў агітбрыгад факультэтаў звязана з многімі цяжкасцямі.

На пасяджэнні культмасавага сектара адказным з факультэтаў было даручана на месцах разгледзець пытанне аб магчымасцях правядзення рэйдаў факультэцкіх агітбрыгад, было разгледжана пытанне аб стварэнні агульнауніверсітэцкай агітбрыгады.

**Л. МЕРДАС.**

*АД РЭДАКЦЫІ. Нягледзячы на тое, што культмасавы сектар камітэта камсамола тры месяцы рыхтаваў адказ на выступленне газеты, ён далёкі ад канкрэтнасці. Хацелася б ведаць і рэдакцыі, і чытачам, як вырашылася пытанне аб стварэнні агульнауніверсітэцкай агітбрыгады, што намечана зрабіць?*

## НЕ ТОЛЬКІ СРОДАК ПЕРАМЯШЧЭННЯ

Заканчваецца Усесаюзны месячнік бяспекі руху. Ён значна падняў культуру руху, яго арганізацыю. Аднак дарожная аварыйнасць працягвае яшчэ заставацца высокай. Штодзённы аналіз дарожна-транспартных здарэнняў дазваляе меркаваць, што безаварыйныя маршруты будуць магчымы толькі тады, калі ўсе—і вадзіцелі і пешаходы — стануць лічыць сябе асабіста адказнымі за бяспеку руху. На жаль, гэта не заўсёды назіраецца. І калі ў аўтагаспадарках ёсць спецыяльныя службы, адказныя за забеспячэнне бяспекі руху, то значна горшыя справы ва ўладальнікаў індывідуальнага транспарту. Тут даводзіцца спадзявацца на асабістае ўсведамленне вадзіцелем сваіх задач як удзельніка руху. Але вельмі часта гэтыя надзеі не апраўдваюцца. Мяркуйце самі: за першую палову месячніка 9 дарожна-транспартных здарэнняў адбылося з удзелам уладальнікаў індывідуальнага транспарту, г. зн. 30 працэнтаў ад усёй колькасці дарожных няшчасцяў выпала на іх долю.

Прывяду некаторыя прыклады. Вадзіцель «Запарожца» Уладзімір Яцко, праязджаючы па вуліцы Матусевіча, наехаў на 8-гадовага хлопчыка. А гэтыя ж сумныя вынікі Яцко мог і павінен быў прадбачыць: гэты ўчастак дарогі быў абазначан знакам «Дзеці».

А матацыклісту Вячаславу Меляшонкаву варта было б памятаць аб правільным выбары скорасці і дыстанцыі паміж рухаючыміся транспартнымі сродкамі. Імена з-за парушэння гэтых патрабаванняў Меляшонкаў сутыкнуўся з машынай, якая ішла ўперадзе.

Што ж з'яўляецца прычынай падобных з'яў? На мой погляд, адбываюцца яны таму, што многія, набываючы ў асабістае карыстанне аўтамабіль, матацыкл або мапед, не ўлічваюць, што транспарт з'яўляецца яшчэ прычынай павышанай небяспекі на вуліцы і патрабуе асаблівай уважлівасці і асцярожнасці.

**Р. АЎРАМЕНКА,**
**інструктар ДАІ УУС Мінгарвыканкома.**



ВА УНІВЕРСІТЭЦКІМ СКВЕРЫ.
Фота Д. Чаховіча.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
АТ 06784 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Заказ 716.
Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.